Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 15/06/2026 05:23:47

DOI:10.17951/sb.2025.19.267-269
Studia Białorutenistyczne 19/2025 MEMORIES OF PROFESSOR
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Volha Tratsiak

University of Warsaw, Poland
e-mail: vtratsiak@uw.edu.pl
https://orcid.org/0000-0001-8803-7075

# In memoriam Прафесар Мікалай Цімашук

*In Memory of Professor Mikolaj Timoshuk*

*In memoriam Profesor Mikołaj Timoszuk*

21 жніўня 2025 г. на 81 годзе жыцця памёр Мікалай Цімашук, прафесар мовазнаўства, русіст, навуковы супрацоўнік Варшаўскага ўніверсітэта. З 1968 г.




Прафесар Мікалай Цімашук (15.06.1944–21.08.2025)

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 15/06/2026 05:23:47



ён быў звязаны з Інстытутам русістыкі, а з 2000 г. – з факультэтам прыкладной лінгвістыкі і ўсходнеславянскіх філалогій. У 2004–2009 гг. – загадчык кафедры беларусістыкі.

Мікалай Цімашук нарадзіўся 15 чэрвеня 1944 г. у вёсцы Войшкі ў гміне Юхновіц Касцельны на Беласточчыне. Пасля заканчэння агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку, паступіў на рускую філалогію філалагічнага факультэта Варшаўскага ўніверсітэта. Пасля другога курса быў накіраваны на працяг навучання ў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. Ламаносава, які скончыў у 1968 г.

Пасля вартання ў Польшу прайшоў гадавую стажыроўку ў Інстытуце русістыкі Варшаўскага ўніверсітэта, дзе застаўся працаваць спачатку асістэнтам, пазней старшым асістэнтам. Тут ён абараніў кандынацкую дысертацыю на тэму словаўтварэння ў рускай мове пад кіраўніцтвам прафесара Пшэмыслава Звалінскага. У тым жа ўніверсітэце атрымаў ступень доктара габілітаванага абараніўшы працу на тэму гукаперáймальных дзеясловаў у рускай мове.

Прафесар Мікалай Цімашук быў звязаны з факультэтам прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта амаль 50 гадоў. Пасля заканчэння навучання ў 1968 г. да верасня 2004 г. працаваў у Інстытуце русістыкі. З верасня 2004, па ўласнай просьбе, быў пераведзены ў кафедру беларускай філалогіі (цяпер кафедру беларусістыкі).

Сваю навуковую дзейнасць прафесар М. Цімашук дасканала спалучаў з кіраўнічымі абавязкамі, якія выконваў на працягу ўсёй сваёй працы на факультэце прыкладной лінгвістыкі. У 1979–1982 гг. ён узначальваў Аддзел дыдактыкі рускай мовы, у 1991–2003 гг. быў загадчыкам завочнага навучання рускай філалогіі, а ў 2004–2009 гг. – загадчыкам кафедры беларусістыкі. Гэта сведчыць пра яго высокую адказнасць, працавітасць і шматбаковасць. Ён кіраваў навуковымі адзінкамі ўзорна і спрыяў іх дынамічнаму развіццю.

Навуковыя зацікаўленні прафесара Мікалая Цімашука ахоплівалі шырокі спектр праблем рускага і беларускага мовазнаўства, гісторыі і сучаснага стану гэтых моў. Пералік яго навуковых прац уключае 95 пазіцый, сярод якіх 10 слоўнікаў, 2 кнігі і шэраг артыкулаў, прысвечаных лексікаграфіі, лексікалогіі, словаўтварэнню ў рускай мове, а таксама гісторыі беларускай мовы. Гэтыя публікацыі складаюць толькі частку навуковага ўкладу прафесара ў развіццё польскай славістыкі.

Асобнай сферай навуковых зацікаўленняў прафесара была праца над перакладам *Святога Пісання* на сучасную беларускую мову. Ён таксама актыўна вывучаў старажытную рэлігійную мову ў стараўкраінскіх і старабеларускіх тэкстах. Вынікі гэтых даследаванняў былі прадстаўлены на міжнародных канферэнцыях і апублікаваныя ў навуковых часопісах, між іншым, „Studia z Filologii Rosyjskiej i Słowiańskiej”, у паасобных выданнях з серыі „Studia Rossica” і „Acta Albaruthenica”.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 15/06/2026 05:23:47



Навуковы ўзровень, шырокія веды і дыдактычны досвед сталі падмуркам для яго эксперцкай дзейнасці. Прафесар Цімашук супрацоўнічаў з двума выдавецтвамі ў якасці рэцэнзента, быў рэдактарам рускамоўнага аддзела ў часопісе „Języki obce w szkole". На працягу многіх гадоў ён быў рэдактарам часопіса "Język Rosyjski" і часопіса кафедры беларусістыкі „Acta Albaruthenica".

За амаль 50 гадоў працы на факультэце прафесар М. Цімашук праявіў сябе як шырока вядомы даследчык, выдатны педагог і шанаваны выкладчык. Вынікам яго працы з'яўляюцца дзясяткі магістарскіх прац і адна кандыдацкая дысертацыя, абароненыя пад яго навуковым кіраўніцтвам.

Прафесар Мікалай Цімашук быў прыкладам чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў навуцы. Дзякуючы такім асобам, як ён, польская русістыка, а пазней беларусістыка на працягу многіх гадоў карысталіся міжнародным прызнаннем і маглі годна канкураваць з навуковымі цэнтрамі Усходняй Еўропы.

Шаноўны Прафесар, Вы назаўсёды застанецесе ў памяці Вашых студэнтаў, калег і сяброў як узор сумленнага навукоўца, справядлівага выкладчыка і чуллівага чалавека.